Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №149 (28513)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Vivat, Францыск Скарына!**

СТАР. 4




**Вашы лісты ў рэдакцыю**

СТАР. 9



**Хто яны – беларускія немцы?**

СТАР. 13

# Нашчадкі Вялікага Кніжніка




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абітурыенткі БДУ Ганна ШАРСТНЁВА і Анастасія АНІКІЕВІЧ, выпускніцы барысаўскай школы нумар дваццаць, каля помніка Скарыну ва ўніверсітэцкім дворыку.

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню

НАПАЧАТКУ БЫЛО Слова

**Гэта проста цуд: праз пяць стагоддзяў мы ведаем не год і нават не месяц — дакладную дату выдання нашай першай друкаванай кнігі. 6 жніўня 1517 года ў Празе чэшскай сын слаўнага горада Полацка Францыск Скарына выдаў «Псалтыр» — першую кнігу на той мове, на якой гаварылі на яго Радзіме...**

**Яго кнігі, калі чытаеш пра іх, уяўляюцца гэткімі масіўнымі фаліянтамі. Насамрэч гэта просценькія невялікія кніжкі звычайнага фармату ў сціплых пераплётах. І ў гэтым яшчэ адзін учынак Скарыны, за які нашчадкі павінны яму дзякаваць. Ён друкаваў кнігі не для багацеяў — для ўсяго «люду паспалітага», як бы сёння сказалі: у бюджэтным варыянце, каб іх маглі набыць і мяшчане, і рамеснікі, і сяляне, каб чыталі самі, каб вучылі чытаць сваіх дзетак. І прадмовы ён да іх пісаў абсалютна жыццёвыя, аб простых рэчах: аб справядлівасці, аб адданасці роднай зямлі. Можа, менавіта дзякуючы гэтай Скарынавай навуцы мы ў наступныя стагоддзі праз прыгнёт і занепад вынеслі і пачуццё ўласнай годнасці, і родную мову, і цягу да асветы?**

**500 гадоў — дата прыгожая і рэдкая. Нам пашанцавала жыць якраз у гэты час і на гэтай зямлі. Адпаведна, і адзначыць яе трэба годна. Як? Проста ўзяць з паліцы (ці адкрыць на планшэце) добрую кнігу і пачытаць. Трэба думаць, Скарыну такое ўшанаванне яго жыцця і спраў прыйшлося б вельмі даспадобы.**

■ Дзяржава і бізнес

## Прадпрымальнікі дайшлі да... лібералізацыі?

**У дзелавых людзей краіны — дзве добрыя падзеі. Адна ўжо здарылася: Мінскаму сталічнаму саюзу прадпрымальнікаў і работадаўцаў 1 жніўня споўнілася 20 гадоў. Столькі ж часу беларускія бізнесмены спрабуюць знайсці агульную мову з уладай. І, як відаць, яны гэта робяць паспяхова. Якраз тут размова заходзіць пра другую падзею, якая чакаецца. Гаворка ідзе пра тое, што неўзабаве будзе падпісаны пакет дакументаў па лібералізацыі бізнесу. А гэта прамое пацвярджэнне таму, што дзелавая ініцыятыва краіне патрэбна.**

### ЧАС ДЛЯ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ?

У Еўропе малыя і сярэднія прадпрыемствы ствараюць каля 50% ВУП. У Беларусі гэтая лічба амаль удвая меншая, але пры гэтым на бізнес ускладаюцца вялікія надзеі і яго вызначаюць асноўным драйверам росту нашай эканомікі. Дык чаго ж чакаць ад новага дакумента? Прарыву? Рэвалюцыі?



На прэс-канферэнцыі 1 жніўня **старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір КАРАГІН** расказаў пра дасягненні за два дзясяткі гадоў дзейнасці грамадскага аб'яднання: «Зараз у аб'яднанне ўваходзяць заснавальнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў малога, сярэдняга і буйнога прыватнага прадпрымальніцтва. Члены саюза — людзі з праверанай дзелавой рэпутацыяй, якія маюць доўгатэрміновыя інтарэсы ў бізнесе. У арганізацыю ўваходзяць больш за 800 удзельнікаў і партнёрскіх прадпрыемстваў. На працягу 20 гадоў арганізацыя прымала ўдзел у стварэнні спрыяльнага дзелавога асяроддзя, у якім прадпрыемствы і прадпрымальнікі ў розных формах могуць развіваць і ўмацоўваць свой бізнес. Саюз удзельнічае ў экспертызе праектаў нарматыўных дакументаў».

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эрома УРБАН, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве:**

*«Што датычыцца нашых новых распрацовак у галіне збожжавых культур, то апошнім часам у дзяржаўны рэестр краіны ўключана 10 новых сартоў. Гэта — сарты азімай пшаніцы, трыцікале, ячменю, азімага жыта — тых валаўтваральных культур, якія сёння ствараюць аснову харчовай бяспекі Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9495 | ▼ |
| Еўра | 2,3157 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0754 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17149>

Да 100-годдзя «ЗВЯЗДЫ» засталося 4 дні

**На ўсе 100!!!**

**100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна. Заставайцеся з намі – будзе цікава! Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.**